**УДК 342**

# ЦЫВІЛЬНА-ВАЙСКОВЫЯ КАМІСІІ ЯК ЭТАП РЭФАРМАВАННЯ АДМІНІСТРАЦЫЙНАГА АПАРАТУ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ У XVIII СТ.

***Л.Д. АНІСЬКОВІЧ***
**(*Прадстаўлена: А.В. ВАЛЕЎКА)***

*Цывільна-вайсковыя парадкавыя камісіі – гэта першыя спецыялізаваныя органы мясцовай улады ў Рэчы Паспалітай, стварэнне каторых стала заключным этапам мадэрнізацыі сістэмы дзяржаўнага кіравання. У артыкуле разглядаецца сутнасць гэтага новаўведзенага інстытута, яго кампетыцыйнае поле і нарматыўнае рэгуляванне яго дзейнасці.*

У Рэчы Паспалітай ідэя рэфарматавання сістэмы дзяржаўнага кіравання пачала паслядоўна ажыццяўляцца ў другой палове XVIII ст. са стварэннем Скарбовай, Вайсковай і Адукацыйнай камісіі. Функцыю найвышэйшага органа дзяржаўнай улады ў 1775-1788 гг. выконвала Пастаянная Рада. У перыяд Чатырохгадовага сойма Пастаянная Рада, якая стала прадметам вострых сутыкненняў, была ліквідавана, а ролю найвышэйшага выканаўчага органа пачала выконваць Варта правоў. Акрамя таго, адміністрацыйная сістэма зазнала чарговыя змены, сведчаннем чаго было з'яўленне Камісіі паліцыі, г.зн. органа цэнтральнага кіравання, які займаўся пытаннямі адміністрацыіі [1, с. 8–9].

Урэшце ў выніку амаль што гадавых парламенцкіх дэбатаў у лістападзе 1789 г. сойм прыняў рашэнне аб заснаванні парадкавых цывільна-вайсковых камісій, якія, па сутнасці, былі першымі ў нашай гісторыі органамі мясцовай адміністрацыі [1, с. 9]. У лістападзе 1789 г. праект аб стварэнні "цывільна-вайсковых камісій", спачатку толькі для ВКЛ, быў ухвалены сеймам. Аўтарамі яго былі літвінскія паслы Т.Ваўжэцкі і М.Бутрымовіч [2, с. 233].

Цывільна-вайсковыя камісіі сталі першымі спецыялізаванымі органамі мясцовай ўлады ў ВКЛ. Іх адміністрацыйна-прававы статус дазволіў Валяр'яну Калінцы нават назваць іх "уладай апякунскай, дабрачыннай і ўсёабдымнай".

Нарматыўнае рэгуляванне дзейнасці гэтых новых органаў мясцовай улады ажыццяўляла соймавая канстытуцыя 1789 г. "Ваяводскія і павятовыя камісіі ў Вялікім Княстве Літоўскім", а іменна яе раздзелы "Аб матэрыі цывільна-вайсковай" і "Аб матэрыі эканамічнай".

Цывільна-вайсковыя парадкавыя камісіі былі суб'ектамі адміністрацыйна-прававых адносін, надзеленымі шырокімі правамі і абавязкамі, што рэгулявалася вышэйзгаданай соймавай канстытуцыяй. У першую чаргу ў іх кампетэнцыю ўваходзіла садзейнічанне арміі ў час правядзення рэкруцкага набору, расквартаванне вайсковых частак, забеспячэнне іх харчаваннем і фінансавымі сродкамі, заснаванне правіянцкіх сховішчаў, разгляд і ўрэгуляванне спрэчак і канфліктаў паміж жаўнерамі і цывільным насельніцтвам. Да задач камісій адносілася забеспячэнне грамадскага парадку і бяспекі ў павеце, а таксама кантроль за міграцыяй насельніцтва, выдача пашпартоў, ажыццяўленне нагляду за рухам бадзяжных, жабракоў і дэзерціраў. Камісіі мелі займацца правядзеннем перапісаў насельніцтва, зборам падаткаў, садзейнічаць развіццю сельскай гаспадаркі, рамяства і гандлю, клапаціцца аб стане транспартных артэрый, наглядаць за мерамі і вагамі [1, с. 30].

Надзённай патрэбай часу, ажыццяўленне якой ускладавалася на мясцовую ўладу, з'явіліся палажэнні аб развіцці адукацыі, што было ўласцівае грамадскай думцы Асветніцтва [1, с. 34]. Таму, у абявязкі камісій таксама было ўключана стварэнне парфіяльных школ і развіццё дабрачыннасці [1, с. 30].

Цывільна-вайсковыя парадкавыя камісіі акрамя шырокіх адміністрацыйных функцый, мелі выконванваць яшчэ і судовыя. Так, у якасці суда 1-й інстанцыі яны разглядалі маёмасныя справы і справы па адміністрацыйных правапарушэннях, канчаткова і безапіляцыйна, калі іск не перавышаў 300 злотых, а кара – 50 злотых і 3 дзён турмы. Астатнія справы па прадстаўленні павятовых дазорцаў адсылаліся па апеляцыі на канчатковы прысуд Камісіі паліцыі абодвух народаў. Разбіралі спрэчкі паміж ваенным і цывільным насельніцтвам, каралі за непаслушэнства публічнай уладзе і землеўладальнікам. Аднак судзіць па крымінальных справах яны не мелі права [3, с. 26].

У камісіі выбіраліся 15 камісараў з неасуджанай і аселай шляхты ў ваяводствах і паветах на сойміках на 2 гады. Без выбрання за грамадскія заслугі ў камісіі ўваходзілі сенатары, ціваны, павятовыя маршалкі, гродавыя старасты, харужыя. Кожная камісія мела канцылярыю з возным і адвакатам. Сесіі

адбываліся штодня акрамя святаў. Камісары выконвалі функцыі бясплатна, але на работу канцылярыі збіралася па шэлегу з кожнага злотага падаткаў. Сесіі адбываліся штодня акрамя святаў. Камісары выконвалі функцыі бясплатна, але на работу канцылярыі збіралася па шэлегу з кожнага злотага падаткаў [3, с. 25].

Колькасць цывільна-вайсковых камісій у ВКЛ адпавядала колькасці адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак [1, с. 34].

Такім чынам, цывільна-вайсковыя камісіі з'яўляліся ўвасабленнем тагачаснай адміністрацыйнай думкі, акрэслілі тэндэнцыю пераходу ад саслоўнага самакіравання ў бок тэрытарыяльнага. Паклалі пачатак мясцовай адміністрацыі на літоўскіх і беларускіх землях. Валодаючы шырокім спектрам правоў і абавязкаў, цывільна-вайсковыя парадкавыя камісіі мусілі адыграць ролю інструмента дзяржаўнай палітыкі, які займаецца рэгуляваннем розных сфераў жыцця. Аднак, ацаніць эфектыўнасць іх работы, на жаль, не прадстаўляецца магчымым, бо вельмі мала часу адвяла гісторыя для рэалізацыі рэформ Чатырохгадовага сойма. Ваенная інтэрвенцыя Расійскай імперыі і далейшы падзел Рэчы Паспалітай не дазволілі здзейсніць гэтыя рэформы.

ЛІТАРАТУРА

1. Гардзееў, Ю. Цывільна-вайсковыя парадкавыя камісіі ў Вялікім Княстве Літоўскім у часы Чатырохгадовага сойма (1789 – 1792) / Юры Гардзееў ; пераклад з польскай мовы Аліна і Зміцер Бялькевічы. – Смаленск: Інбелкульт, 2014. – 436 с.
2. Гісторыя Беларусі : ў 6 т. / Ю. Бохан [і інш.]. – Мінск: Экаперспекыва, 2007. – Т. 3 – С. 344.
3. Радаман, А. Соймік // Вялікае Княства Літоўскае. Энцыклапедыя : ў 2 т. – Мн.: Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2007 – Т. 2 – С. 25 – 26.